3. *Дранько-Майсюк, Л.* Гаспода : выбранае / Л. Дранько-Майсюк. – Мінск : Маст. літ., 1998. – 382 с.
4. *Дуктава, Л. Г.* Мастацкая анімалістыка ў беларускай літаратуры другой паловы ХХ ст. : манаграфія / Л. Г. Дуктава. – Магілёў : МДУ імя А. А. Куляшова, 2009. – 184 с.
5. *Швед, І. А.* Міфалогія колеру ў беларускай традыцыйнай духоўнай культуры / І. А. Швед. – Брэст : БрДУ, 2011. – 291 с.

*А. С. Гурская (Беларусь)*

# ЛІТАРАТУРНЫ ПРАЦЭС І ТВОРЧАЯ ІНДЫВІДУАЛЬНАСЦЬ ЯК ПРАДМЕТ ПЕРААСЭНСАВАННЯ І РЭФЛЕКСІІ Ў КНІЗЕ АЛЕГА ЛОЙКІ «ГАЛГОФА»

Пра паяднанасць, сумяшчэнне ў творчай асобе Алега Антонавіча Лойкі талентаў пісьменніка і даследчыка літаратуры гаварылася шматразова і слушна, асабліва ў кнізе «Чалавек з сонечнаю ўсмешкай» (2019). Няпроста сказаць, які з гэтых талентаў больш важкі, вызначальны, паколькі і паэтычна-празаічная спадчына, і плён навуковых пошукаў А. Лойкі пазначаны (выкарыстаем тут словы М. Стральцова) «пячаткай майстра», абедзве сферы яго духоўнай дзейнасці – мастацкая і даследчая – аднолькава, бадай, выніковыя (невыпадкова на працягу дзесяцігоддзяў ім аддадзена столькі сіл і імпэту!). І грамадская ацэнка зробленага ў абодвух выпадках высокая і, можна сказаць, роўнавялікая: член-карэспандэнт Нацыянальнай акадэміі навук (1989) – так прызнаны яго заслугі перад айчынным літаратуразнаўствам, лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Беларусі імя Якуба Коласа (1990) – гэтым званнем ён уганараваны за ўклад у нацыянальнае прыгожае пісьменства (пералік іншых рэгалій і ўзнагарод апускаем). Таму ўяўляецца, што ішло няспыннае ўзаемаўзбагачэнне дзвюх граняў прыроднага дару: з аднаго боку, практычнае валоданне сакрэтамі паэтычнай творчасці спрыяла больш тонкаму пранікненню ў «староннi» мастацкі свет, а з другога – праз навукова-крытычнае асэнсаванне творчых набыткаў іншых пісьменнікаў (асабліва, калі гэта пісьменнікі-класікі) выпрацоўваліся, карэкціраваліся і ўласныя эстэтычныя крытэрыі.

У якасці падмацавання сказанаму спашлёмся на аўтарытэт В. П. Рагойшы, які не адно дзесяцігоддзе ведаў А. А. Лойку «зблізку». Зрабіўшы агаворку, што «…лёс пісьменніка, які займаецца паэтычнай і крытычнай дзейнасцю адначасова», нялёгкі, знакаміты знаўца тэорыі літаратуры працягваў: «…Такое спалучэнне – «чыстага» пісьменніка і літаратуразнаўца, крытыка, калі яно толькі абумоўліваецца характарам таленту, – заўсёды дабро. Бо грамадзянская відушчасць і літаратуразнаўчая «ўзброенасць» крытыка не могуць не пазначыцца на змесце і форме яго ўласнай

паэтычнай творчасці. У сваю чаргу, саманазіранні над працэсам творчасці, развітае эстэтычнае пачуццё паэта ў многім прадвызначаюць аб'ектыўнасць і глыбіню яго крытычных меркаванняў. Адным словам, паэт-крытык, паэт-літаратуразнавец, якім з'яўляецца Лойка, – спалучэнне гэта калі ўжо не для самога пісьменніка, то для літаратуры надзвычай спрыяльнае» [2, с. 71].

Гэтую спрыяльнасць, у прыватнасці, засведчыла Лойкава «стокніжжа» (М. Скобла) – 100 кніг рознай родава-жанравай прыналежнасці, ідэйна-сэнсавай напоўненасці, стылявога афармлення – кніг лірыкі і паэмнага эпасу, прозы, перакладаў, крытыкі, прац па літаратуразнаўстве (не кажучы пра тысячы публікацый у перыёдыцы). Такое нават цяжка ўявіць, але насамрэч усё гэта выйшла з-пад пяра аднаго чалавека!

Прызнаючы, што кожнае з выданняў «стокніжжа» па-свойму вартаснае, хочацца згадаць тыя з іх, якія сталі, па сутнасці, настольнымі: раманы-эсэ пра Янку Купалу (дап., дапрац. выд., 1992) і пра Ф. Скарыну (1990), двухтомная «Гісторыя беларускай літаратуры: дакастрычніцкі перыяд» (2-е дапрац. выд., 1989), кніга выбранай паэзіі «Скрыжалі» (1981) і паэтычныя зборнікі мяжы тысячагоддзяў «Неўміручасць» (2000) і «Ушанаванне» (2001), пераклады выбраных вершаў П. Верлена «У месяцавым ззянні» (1974), успаміны «Дрэва жыцця» (2004), кніга эсэ «Займальная літаратура» (2009) і абраная для разгляду «кніга лёсаў» «Галгофа» (2001).

У творчым набытку А. Лойкі «Галгофа» займае асаблівае месца: ніводная з яго папярэдніх кніг з такой гранічнай адкрытасцю, грамадзянскай усхваляванасцю, душэўным самавыдаткаваннем не выяўляла асобу аўтара. Да гэтага, безумоўна, прычынілася пазначаная грамадскімі пераменамі рэальнасць. «Слухайце час!» – гаварыў глыбокашанаваны А. Лойкам «нашанівец» М. Багдановіч, адгукаючыся на зменлівыя, часта драматычныя падзеі сучаснага яму жыцця. Літаратурны нашчадак аўтара «Вянка» *слухаў* свой час – канец 1980-х – 1990-я гг. – і гэтак жа быў заангажаваны беларушчынай, як калісьці Янка Купала, Якуб Колас, М. Багдановіч, Власт, Алесь Гарун, М. Гарэцкі. Сапраўды, час заўсёды выбірае нераўнадушных, неабыякавых да лёсу Радзімы, будучыні народа людзей.

«Галгофа» ўвабрала, высвеціла агромністы досвед Лойкі-даследчыка, мастака слова, універсітэцкага прафесара філалогіі, засведчыўшы ў чарговы раз шматграннасць яго прыроднага дару. «Літаратурнай энцыклапедыяй літаратуры Заходняй Беларусі» [1, с. 227] назваў А. Лойка незабыўнага У. А. Калесніка (арт. «Быў ён чалавекам Адраджэння»). Самога А. Лойку хочацца назваць энцыклапедыяй усёй беларускай літаратуры (прынамсі, кніга «Галгофа» да гэтага падводзіць): яго веды пра літаратурны працэс на Беларусі, пачынаючы раннім Сярэднявеччам і заканчваючы мяжой тысячагоддзяў, усеахопныя, энцыклапедычныя.

Звязаўшы назву выдання з пакутніцкім шляхам Хрыста і ўдакладніўшы ў падзагалоўку, што гэта «кніга лёсаў», А. Лойка тым самым падкрэсліваў: такім жа крыжовым, поўным выпрабаванняў і пакут быў шлях развіцця роднай літаратуры, яе гістарычны лёс («канцэпцыя трагедыйнага наканавання» [1, с. 201]); такімі ж пакручастымі, нярэдка пакутніцкімі былі чалавечыя і творчыя лёсы многіх і многіх яе стваральнікаў. І гэта незалежна ад таго, ці іх жыццё абарвалася дачасна, ці зведала яно «маральную загубу», «дэпрэсію духу» ва ўмовах ідэалагічнага прэсінгу, ці было высільваннем чарговай прэміі, марнай растратай дзён.

Пэўная частка ўключаных у кнігу матэрыялаў (пагодзімся з Г. Тычко) – гэта «навукова-публіцыстычныя і палемічныя выступленні «на патрэбу дня»« [3, с. 98] («Філалагічнай адукацыі – прыярытэт», «Адраджэнне без кансалідацыі?», «Навука навук – філалогія», «Аб адным прытаптаным слове», «Давер і адказнасць», інш.). Іх пісаў, не мог не пісаць чалавек, заклапочаны лёсам гуманітарнай адукацыі, роднай мовы, праблемамі падрыхтоўкі будучых філолагаў (нагадаю, што падобнымі пытаннямі Алегу Антонавічу як тагачаснаму загадчыку кафедры беларускай літаратуры БДУ, а пасля ў адной асобе яшчэ і дэкану філалагічнага факультэта даводзілася займацца сама што ні на ёсць практычна).

Пераважную большасць прадстаўленых у «Галгофе» публікацый, што і сталі найперш прадметам пераасэнсавання і аўтарскай рэфлексіі, склалі, безумоўна, літаратуразнаўчыя, метадалагічна і канцэптуальна выверaныя артыкулы-даследаванні («На трагічных перавалах. Шляхамі беларускай паэзіі ХХ стагоддзя», «Перыядызацыя – гэта сур’ёзна», «Сквозь дебри мифов продираясь», «На высокім алтары. Беларуская паэзія 1991 года», «З настальгіяй па тэорыі», «Ці абавязаны паэт быць грамадзянінам?..», «У параметрах канцэптуальнага пераасэнсавання», «На парозе падагульнення. Спроба канцэптуальнай інтэрпрэтацыі беларускай літаратуры ХХ ст.», інш.), а таксама творчыя партрэты, штрыхі да партрэтаў, эсэ пра знакавыя постаці айчыннага прыгожага пісьменства («Не на камень падала зерне» – пра Ф. Багушэвіча, «Янка Купала – наша будучыня», «Любімы, народны, векавечны» – пра Якуба Коласа, «У Максіма Танка ёсць усё», «Быў ён чалавекам Адраджэння» – пра У. Калесніка, «Пра Барадуліна без цытатаў», «Паэт высокага рангу» – пра А. Вялюгіна, «Паэт-сустрэча» – пра М. Аўрамчыка, «Кладачка тоненька» – пра Я. Янішчыц).

Вядома, што такая сфера выяўлення вербальнай культуры, як літаратурны працэс, падразумявае наяўнасць цэлага комплексу ўзаемазвязаных кампанентаў рознага часавага паходжання, гэтаксама як і творчая індывідуальнасць пісьменніка – паняцце сінтэзнае, шматаспектнае. Аўтар «Галгофы», будучы выдатна «падкаваным» у тэорыі, не займаецца адцягненым тэарэтызаваннем, яго мэтавая ўстаноўка – выпрацаваць метадалагічныя прынцыпы перыядызацыі літаратурнага працэсу, знайсці крытэрыі, падыходы да канцэптуальнага пераасэнсавання слоўнага мастацтва на ўсіх этапах яго развіцця, ачысціць прачытанне і літаратуры ў цэлым, і мастакоўскіх індывідуальнасцей у прыватнасці ад трафарэтаў, ідэалагічных клішэ мінулых дзесяцігоддзяў, аддаць даніну памяці тым, хто нярэдка цаной уласнага жыцця захаваў вернасць агульначалавечым і нацыянальным ідэалам, не здрадзіў беларускаму слову.

У артыкулах больш ранняга, яшчэ перабудовачнага перыяду аўтару шматразова, з прыцягненнем багацейшага фактычнага матэрыялу даводзілася даказваць, пераконваць і шараговых рэцыпіентаў сваіх публікацый, і тых, ад каго залежаў лёс літаратуры, адукацыі, у неабходнасці, з аднаго боку, актывізаваць навукова-даследчы пошук, а з другога – прыняць практычныя захады, каб наяўныя лакуны і ў навуцы, і ў вучэбным працэсе, і ў рэдакцыйна-выдавецкай дзейнасці закрываліся як мага хутчэй.

Даследчык настойліва падкрэсліваў важнасць сучаснай, навукова абгрунтаванай перыядызацыі літаратурнага працэсу і прапаноўваў у якасці крытэрыю прынцып цэласнасці. Неаднойчы будзе сказана ім пра недаацэнку Сярэднявечча,

пра мэтазгоднасць выдзялення трох стадый у развіцці літаратуры Адраджэння, пра неабходнасць уключэння ў агульнакультурны кантэкст шматмоўнай літаратуры некалькіх папярэдніх стагоддзяў і да т. п. У шэрагу матэрыялаў постсавецкага часу (як, напрыклад, у артыкулах «На парозе падагульнення», «У параметрах канцэптуальнага пераасэнсавання») А. Лойка з задавальненнем канстатаваў, што многія з узнятых ім і яго аднадумцамі пытанняў вырашаюцца.

Асаблівы гонар, боль і прадмет рэфлексавання А. Лойкі – гэта слоўнае мастацтва XX ст., творчыя набыткі, упушчэнні як пісьменнікаў-класікаў, так і сучасных аўтараў, нярэдка яго літаратурных равеснікаў, а то і вучняў. Зноў і зноў, не баючыся паўтарэнняў, аўтар шукае адказу на «праклятае» пытанне: як сталася, што крутыя зломы гісторыі аказаліся такімі неміласэрнымі ў дачыненні не толькі да людзей, але і да іх творчага плёну? Даследчык развенчвае калі не ўсе, то многія міфы сацрэалізму, яго «тры кіты» (П. Васючэнка), што мелі як тэарэтычную падаснову, так і негатыўныя практычныя вынікі. Сярод іншага ён адмаўляе т. зв. «рэвалюцыйную радасць» нашых першых народных паэтаў, праводзіць ідэю ўзвышэнства, новапарнаскасці, самакаштоўнасці літаратуры, прывіваючы тым самым эстэтычную плынь у мастацтве слова, тую плынь, якую на пачатку XX ст. сцвярджалі М. Багдановіч, Власт, Антон Навіна.

У тым, што айчынны літаратурны працэс, многія творчыя індывідуальнасці «адваяваны ад вульгарнага сацыялагізму, <…> ад сацрэалістычнай рэгламентацыі, ад дэмагогіі, якая палітызавала, дэгуманізавала, дээстэтызавала літаратуру, гвалцячы ў ёй як нацыянальныя, так і агульначалавечыя каштоўнасці» [1, с. 204], неацэнная заслуга аўтара «кнігі лёсаў» «Галгофа».

## Літаратура


1. *Лойка, А.* Галгофа : кніга лёсаў / А. Лойка. – Слонім : Слонім. друк., 2001. – 288 с.
2. *Рагойша, В.* Лінія жыцця / В. Рагойша // І адгукнецца слова ў слове… : літ.-крытыч. арт., эсэ, дыялогі. – Мінск, 1992. – С. 67–76.
3. *Тычко, Г.* Паэт у літаратуразнаўстве / Г. Тычко // Чалавек з сонечнаю ўсмешкай : кніга пра Алега Лойку ; рэдкал. : А. Бельскі (уклад.) і [інш.]. – Мінск, 2019. – С. 97–101.



*Н. В. Гурская (Беларусь)*


# АПОВЕСЦЬ «ПАЙСЦІ І НЕ ВЯРНУЦЦА» ВАСІЛЯ БЫКАВА: ПАЧУЦЦІ ПАД УПЛЫВАМ АБСТАВІН

Героям Васіля Быкава, што ўвайшоў у гісторыю беларускай і сусветнай літаратуры як праўдзівы летапісец Вялікай Айчыннай вайны, заўсёды даводзіцца